# Мясціны, якія памятаюць Коласа

**Усё, звязанае з жыццём і творчасцю слынных песняроў, ашчадна захоўваецца і перадаецца з пакалення ў пакаленне. Невядомыя звесткі ў біяграфіях паэтаў, як крупінкі памяці аб іх, збіраюць у музеях і робяць набыткам культурнай спадчыны народа. Так, філіял Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа складаецца з чатырох мемарыяльных сядзіб. Усе гісторыка-культурныя аб'екты дзейнічаюць, прымаюць наведвальнікаў, экскурсійныя турыстычныя групы, з'яўляюцца асяродкамі культурна-асветніцкай працы, месцамі, дзе пастаянна адбываюцца сустрэчы аматараў прыгожага пісьменства, літаратурна-музычныя імпрэзы.**

## Акінчыцы

На мемарыяльнай дошцы, прымацаванай да сцяны сядзібы ў Акінчыцах, пазначана: «Тут 3 лістапада 1882 г. нарадзіўся народны паэт Беларусі Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч)». У Акінчыцах было першае месца службы бацькі будучага пісьменніка, Міхаіла Казіміравіча. З 1 красавіка 1881 года ён два гады быў у князя Радзівіла ляснічым.



Сядзіба ляснічага-каморніка і хата з трыма вокнамі, накрытая дранкай, адноўлены да 100-годдзя песняра, у 1982 годзе. У кастрычніку мемарыяльная сядзіба прыняла першых наведвальнікаў. Побач з хатай — пуня і стайня пад саламяным дахам, калодзеж з журавом, кладоўка. Тут жа і дарога, што называлася Кацярынінскім трактам. Інтэр'ер сядзібы ўзноўлены па ўспамінах родных песняра і мясцовых жыхароў. Абсталяванне ў ёй — як у звычайнай сялянскай хаце: падвешаная да столі люлька для немаўляці, стол пад абрусам, куфар, лава. І, вядома ж, печ, прытулак для старых і малых. Каля печы — кадка для цеста, гаршкі ды іншае гаспадарчае начынне. Сярод экспанатаў — аналагі прадметаў, якімі карысталася сям'я Міцкевічаў, прадметы сялянскага побыту канца XIX стагоддзя.

# Ласток

Ласток — трэцяе месца жыхарства бацькоў Якуба Коласа. Сюды яны пераехалі 1 лістапада 1885 года і жылі амаль 5 гадоў, да красавіка 1890-га.

У Ластку тады было ўсяго дзве хаты: у новай жыла сям'я бацькоў будучага пісьменніка, а ў старой — майстры, якія рабілі драніцу (тое, чым накрывалі хату). І хата, і гумно захаваліся да нашых дзён. Сцены гэтых будынкаў аўтэнтычныя, памятаюць маленькага Костуся і яго сям'ю. Менавіта таму з усіх мемарыяльных сядзіб Ласток уяўляе найбольшую каштоўнасць: ён захаваў свой першапачатковы выгляд з невялікімі рэстаўрацыйнымі зменамі, у той час як пабудовы ў Акінчыцах, Смольні і Альбуці адноўлены па архіўных матэрыялах.

У гэтым глухім куточку, як пасля пісаў Колас у аўтабіяграфіі, прайшлі яго раннія дзіцячыя гады. Тут ён пачаў цікавіцца навакольным светам па-за межамі сядзібы, аб якім размаўлялі дарослыя. Пра леснікові побыт, праявы службовага характару і адносіны да ляснічага — усё было цікава малому. Магчыма, менавіта адсюль паўстаў потым вобраз Музыкі.



*Фота прадастаўлена Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеем Якуба Коласа.*

Акрамя аўтабіяграфіі, пясняр згадваў Ласток ва ўспамінах, паэме «Новая зямля», аповесці ў вершах «Грушы-сапяжанкі».

У 1997 годзе ў Ластку адкрыта экспазіцыя па матывах паэмы «Сымон-музыка». Рукапісы паэмы, яе выданні розных гадоў, пісьмы, дакументы, фотаздымкі, вырабы народных майстроў Стаўбцоўшчыны, творы беларускіх мастакоў — тое, што прадстаўлена да ўвагі наведвальніка.

У планах супрацоўнікаў музея, як паведаміў загадчык навукова-асветніцкага аддзела ўстановы Анатоль Астаповіч, зрабіць рамонт у гэтым помніку драўлянага дойлідства, пасля чаго тут прадугледжана адкрыццё выстаўкі пад назвай «Дзве стыхіі», па матэрыялах якой можна будзе даведацца аб лясных промыслах і водным транспарце ў Беларусі. Тэматычны план ужо распрацаваны.

# Альбуць

Альбуць стала чацвёртым месцам службы ляснічага Міхаіла Міцкевіча. У Альбуцкую сядзібу ён пераехаў з сям'ёй у 1890 годзе. Праз год жыцця на долю Міцкевічаў выпала няпростае выпрабаванне: калі нікога не было дома, у сядзібе здарыўся пажар, што знішчыў усё дазвання. Новую хату ўзвялі ў тым жа годзе. Згодна з архіўнымі дакументамі, збудавана яна была «на каменным падмурку, з абчасаных хваёвых брусоў, у гладкі вугал, накрытая гонтай, з дашчанай падфутроўкай пад дахам, з двума шчытамі з дошак». У хаце былі вялікі светлы пакой, сенцы і кладоўкі, цагляная печ, а падлога і столь — з дошак.



Альбуцкія гады — ці не самы працяглы перыяд у дзяцінстве-юнацтве будучага паэта: тут сям'я правяла 12 гадоў (з 1890 да 1902 года). Убачанае і перажытае стала асновай і тым падмуркам, на якім узгадаваўся талент паэта. Якуб Колас пісаў у аўтабіяграфіі: «Альбуць запомнілася мне найболей яскрава. Там была надзвычай цікавая прырода. Лесьнікова пасада стаяла на бойкай дарозе, кудою ішлі і ехалі людзі. Нязмоўклыя цікавыя гутаркі новых людзей пашыралі мой запас ведаў аб людзях і наогул аб жыцці і далі мне багаты матэрыял для назірання».

У Альбуці Костусь навучыўся чытаць, адсюль хадзіў у народнае вучылішча ў вёсцы Мікалаеўшчына, менавіта тут напісаў першы верш. Адсюль паехаў Костусь на вучобу ў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, сюды вяртаўся з Палесся ўжо настаўнікам — правесці лета. Альбуцкія краявіды апісаны ў многіх творах Коласа, а ў «Новай зямлі» Альбуць паслужыла правобразам Парэчча.

У Альбуці ў 1902 годзе, так і не стаўшы гаспадаром на сваёй зямлі (пра што марыў усё жыццё), памёр бацька пісьменніка Міхаіл Казіміравіч. У 1990 годзе ў аднаўленай сядзібе была створана літаратурна-мемарыяльная экспазіцыя па матывах паэмы «Новая зямля». Тут прадстаўлены фотаздымкі прататыпаў герояў паэмы, рукапісы, выданні паэмы розных гадоў, прадметы сялянскага побыту XIX—XX стагоддзяў. Канцэпцыя выбудавана такім чынам, што наведвальнік нібы апынаецца ў хаце, якую гаспадары пакінулі зусім нядаўна і ненадоўга: яшчэ трошкі, і прыбягуць дзеці, маці зноў будзе завіхацца каля печы, на падворку будзе нешта майстраваць дзядзька Антось. Як ілюстрацыя да пчалярскай і рыбалавецкай тэм у «Новай зямлі» — выстаўка «Пчалярства і рыбалоўства», якая месціцца ў аднаўленым гумне.

У 2013 годзе ў адной з гаспадарчых пабудоў была створана першая частка экспазіцыі «Прырода ў жыцці і творчасці Якуба Коласа» — інтэрактыўная зона «Хатка знахаркі» (лекавыя травы ў сям'і Міцкевічаў). Экспазіцыя ўяўляе сабой рэканструкцыю часткі хаты (ад чырвонага кута да печы) вясковай бабкі-знахаркі, дзе прадугледжана рабочая зона для прыгатавання і захавання лекавых траў і настояў з іх.

У прасторнай сядзібе за агароджай — хлеў, гумно, побач з імі — павець з гаспадарчым начыннем, тут жа расце груша-дзічка.

# Смольня

Мару аб уласным доме Міцкевічы ўсё ж ажыццявілі. Праз восем гадоў пасля смерці Міхаіла Казіміравіча яны набылі сядзібу ў Смольні (цяпер — у межах горада Стоўбцы). Праўда, сам пісьменнік на той час адбываў пакаранне ў турме за ўдзел у нелегальным настаўніцкім сходзе і прыехаў толькі 19 верасня 1911 года. Жылі тут маці Ганна Юр'еўна (дзе і завяршылася яе жыццё ў 1929 годзе), дзядзька Антось (адышоў у 1918 годзе), сёстры паэта Міхаліна, Алёна, Марыя, браты Улад, Міхась і Іосіф. Беднай і запусцелай падалася Якубу Коласу Смольня. Каб месца гэтае набыло хоць трохі ўтульнасці, пісьменнік пасадзіў дрэвы. Ліпы гэтыя жывуць у мемарыяльнай сядзібе і сёння. У іх ценях сядзелі маладыя Колас і Купала, калі ўпершыню сустрэліся ўлетку 1912 года.




Два слынныя паэты марылі сустрэцца даўно, але заміналі розныя перашкоды. Якуб Колас згадваў: «Я быў пад нядрэмным вокам паліцыі. За кожным крокам маім яна пільна сачыла...» Пад уражаннем ад вандроўкі ў Смольню Купала распавядаў: «Пазваў мяне ў госці Якуб Колас. Грошай, як заўсёды, у мяне не было, каб наняць балагола, і я рашыў са станцыі Стоўбцы да вёскі ісці пехатою. Іду, іду, ужо і цямнець пачынае, кругом лес. Няма ў каго спытацца дарогі. Баяўся, што прыйдзецца ў незнаёмым вялікім лесе заначаваць, а тут і есці хочацца. Раптам павеяла вільгаццю, і я ўспомніў, што, па словах Якуба Коласа, Мікалаеўшчына стаіць на беразе Нёмана. Вось і пайшоў я ў гэтым напрамку. Так і дайшоў шчасліва да самай Коласавай хаты».

У Смольню Якуб Колас некалькі разоў прыязджаў у 1911—1914 гадах, працаваў тут над паэмамі «Новая зямля» і «Сымон-музыка», пісаў вершы і аповесці. Ёсць пра сядзібу радкі і ў трылогіі «На ростанях». Апошні раз пясняр наведаў Смольню 30 красавіка 1956 года, нібы развітваючыся з ёй.

Філіял Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа быў тут адкрыты ў 1967 годзе. Музейная прастора складаецца з дзвюх частак — мемарыяльнай і літаратурнай. Дом, дзе доўгі час жыў брат Якуба Коласа Іосіф Міцкевіч з сям'ёй, стаў музеем да 90-годдзя песняра ў 1972 годзе. Інтэр'ер мемарыяльнага дома адноўлены па ўспамінах блізкіх паэта. Этнаграфічныя прадметы «ілюструюць» тагачасны сялянскі побыт, атмасфера гэтага месца захоўвае дух сям'і Міцкевічаў. У межах сядзібы адноўлены хлеў, гумно. У пабудаваным двухпавярховым будынку размешчана літаратурная экспазіцыя, якая знаёміць з дзяцінствам і юнацтвам паэта, таксама ўтрымлівае матэрыялы, дзе распавядаецца пра яго далейшы жыццёвы і творчы шлях. Пісьмы Якуба Коласа да землякоў, фотаздымкі, дакументы, рэдкія выданні твораў, арыгінальныя матэрыялы не пакідаюць абыякавымі нікога з наведвальнікаў.

**Яна БУДОВІЧ**

**Фота Кастуся ДРОБАВА**